# ЛЕКТАР І ЖЫЦЦЁ

Знамянальная і дзіўная з'ява: у век шырокага патоку інфармацыі праз радыё, тэлебачанне, друк неабходнасць у жывым слове — лекцыі, гутарцы не толькі не паніжаецца, а узрастае. Аб гэтым сведчаць даныя сацыялагічных аналізау. Відавочна, справа заключаецца у якасці інфармацыі і характары яе уздзеяння на чалавека, які адчувае патрэбу у кантакце з лектарам.

У нашы дні лектар нярэдка мае справу з аудыторыяй, якой ужо вядома большая частка падзей і фактау, аб якіх павінен гаварыць лектар. Таму галоунай задачай становіцца уменне адказваць не на пытанні тыпу «як?», а на пытанні «чаму?» Гэта ужо звязана з неабходнасцю прымусіць слухача быць саудзельнікам пошукау навуковай ісціны.

Разавая лекцыя у масавай аудыторыі — не фрагмент з універсітэцкага курса, а асобны від творчай, палітычнай і арганізатарскай дзейнасці. Вельмі няпростая гэта справа праводзіць лекцыі не у спецыяльна абсталяванай зале, а прама у цэху, сярод станкоу і верстакоу у кароткі час абедзеннага перапынку. Тут ужо не да доугіх уступау, карцінак, уводных эпізодау. Тут даводзіцца ужываць прамы пачатак, адразу браць «быка за рогі», захапіць увагу слухачоу.

Праблема кіравання аудыторыяй, адносіны са слухачамі — складаны і тонкі від дзейнасці лектара-прапагандыста. Не будзем гаварыць аб майстэрстве лектара. Аб гэтым многа напісана. Я хачу толькі падкрэсліць, што слова — гэта наш сродак вытворчасці, гэта зброя, валодаць якой трэба дасканала. У. І. Ленін высока цаніу значэнне вуснага слова у абгрунтаванні і распаусюджанні навуковых ведау, палітычных перакананняу і практычных мер у галіне дзяржаунага, гаспадарчага і культурнага будауніцтва.

Дзейснасць лекцыйнай прапаганды цяжка перааценіць. Ці існуе эканамічны паказчык дзейнасці лектара? Мы яшчэ не маем неабходных індыкатарау, каб дакладна і якасна вымераць тое складанае уздзеянне, якое аказвае слова лектара на працэсы унутранага жыцця і духоунага свету чалавека. Яскравы прыклад. Рабочы Мінскага аутамабільнага завода мне гаварыу:

— Я, ведаеце, да «казла» вялікі ахвотнік. Раней, бывала, лекцыя у абед — не іду. А вось цяпер, як паслухау разумныя размовы, я «казла» закінуу. З задавальненнем слухаю гутарку. Цікавей, чым тэлевізар. Жывы ж чалавек гаворыць. Табе гаворыць. Разумееце, не чытае, а гаворыць.

Каментарыі не патрэбны.

Наша універсітэцкая арганізацыя «Веды» выкарыстоувае розныя формы прапаганды: гутаркі, сустрэчы, навукова-тэарэтычныя і навукова-практычныя канферэнцыі і г. д. Больш пяцісот лектарау-энтузіястау штогод праводзяць больш трох тысяч лекцый на грамадскія і прыродазнауча-навуковыя тэмы. Геаграфія нашых выступленняу — не толькі наша рэспубліка, але і далёкія месцы і будоулі цалінных зямель і іншых рэспублік. Варта адзначыць актыунасць камітэта камсамола і студэнцкіх арганізацый у справе лекцыйнай работы.

Вялікую ініцыятыву праяуляе кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі (загадчык прафесар В. І. Сцяпанау), якая у кастрычніку—лістападзе 1970 года правяла дзевяць навукова-тэарэтычных канферэнцый, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння Ф. Энгельса. Прафесар І. М. Лушчыцкі тройчы выязджау у розныя месцы Беларусі з цікавай лекцыяй «Энгельс і рэвалюцыйная Беларусь».

Па выніках грамадскага агляду у сувязі з падрыхтоукай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна арганізацыя «Веды» БДУ заняла першае месца у рэспубліцы і узнагароджана дыпломам І ступені.

Нам трэба і далей усямерна павышаць навукова-тэарэтычны узровень выступленняу, паглыбляць аргументаванасць і доказнасць нашых лекцый. Акрамя інфармацый, неабходна уменне выкарыстоуваць арсенал тактычных прыёмау і дыскусій, палемікі. Нарэшце, важным з'яуляецца жаданне і гатоунасць выступаць перад працоунымі, у самай разнастайнай аудыторыі.

Найбольш характэрныя недахопы у нашай дзейнасці заключаюцца, па-першае, у няуменні па-сапрауднаму спланаваць работу на факультэтах, па-другое, планы выконваюцца не поунасцю, па-трэцяе, мала вывучаецца і абагульняецца вопыт лепшых лектарау, па-чацвёртае, да гэтай пары нездавальняюча пастаулена работа па падрыхтоуцы маладых лектарау.

Само жыццё абавязвае нас удасканальваць якасць лекцыйнай работы. Арганізацыя таварыства «Веды» БДУ рыхтуецца цяпер да 50-годдзя нашага універсітэта — першай вну у БССР, вядучага цэнтра навукі і культуры рэспублікі. Мы прыкладзем усе намаганні, каб наша лекцыйная работа знаходзілася на узроуні задач, пастауленых КПСС.

Навуковыя работнікі — лектары БДУ з гонарам выконваюць сацабавязацельствы, узятыя у сувязі з надыходзячым XXIV з'ездам нашай партыі.

**М. РЭЗНІКАЎ,**
**дацэнт, старшыня праулення арганізацыі таварыства «Веды» БДУ.**

**Вучоны, выкладчык, прапагандыст, выхавацель не толькі шматтысячнага атрада студэнцкай моладзі, але і самых разнастайных кантынгентау слухачоу у горадзе і на сяле — такі ён, член таварыства «Веды» БДУ.**

**З вялікім майстэрствам і адказнасцю, добрасумленна і захоплена выконваюць нашы лектары свой пачэсны абавязак. Аб гэтым сведчаць і граматы Мінскага аутазавода, опернага тэатра, падшэфнай воінскай часці, і перамога у рэспубліканскім спаборніцтве у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, і шчырыя падзякі удзячных слухачоу.**

**На днях на пасяджэнні парткома БДУ разгледжана пытанне «Аб лекцыйнай прапагандзе у падшэфных раёнах Мінскай вобласці і г. Мінску». Запрошаныя прадстаунікі гэтых раёнау тт. Дарашкевіч І. Г., Якубовіч Р. Ф. (Дзяржынск), Яцэвіч М. М. (завод «Транзістар»), Турко А. М. (Стоубцы), Матусевіч Р. Е., Кукранская Э. Э. (Барысау) выказалі падзяку універсітэцкім лектарам, расказалі аб сваіх планах і запатрабаваннях слухачоу, дамовіліся аб яшчэ больш цесных кантактах.**

**Сёння мы запрасілі выступіць на старонках газеты членау універсітэцкага таварыства «Веды» з расказамі аб сваёй лектарскай працы, уражаннях, падарожжах.**

Першая лекцыя у адкрытым на днях у БДУ лекторыі «Электронныя вылічальныя машыны у інжынерных разліках». Слухачамі тут сталі 450 інжынерна-тэхнічных работнікау з мінскіх прадпрыемстваў.

Лекцыю чытае загадчык кафедры ЭММ дацэнт М. М. Пасноў.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



# У ЦЭХАХ АЎТАМАБІЛЬНАГА

Паміж Мінскім аутазаводам і нашым універсітэтам дауно устанавіліся добрыя адносіны, сяброускія сувязі. І гэта прыносіць узаемную карысць. Нямала былых і цяперашніх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікау і служачых завода вучацца або ужо закончылі універсітэт. Ёсць кантакты і у навукова-даследчай рабоце. Нашы выкладчыкі аказваюць пастаянную дапамогу партыйнай арганізацыі завода у правядзенні ідэалагічнай работы сярод аутамабілебудаунікоу. Адна з такіх форм — сістэматычныя выезды універсітэцкіх лектарскіх груп на аутазавод. Нашы выкладчыкі і аспіранты выступаюць перад рабочымі і служачымі з лекцыямі, дакладамі, праводзяць гутаркі, адказваюць на шматлікія пытанні, якія цікавяць рабочую аудыторыю.

Адзін з такіх выездау быу 12 студзеня. У лектарскую групу уваходзіла 11 чалавек. Сярод іх выкладчыкі гісторыі КПСС А. В. Еракcін, В. Ф. Беркау, Г. І. Ермашкевіч, Я. І. Калеснік, В. З. Продчанка, палітэканомы—Т. І. Адамовіч, А. Я. Бураускі, філосафы — В. І. Бартон, Г. В. Рубанау, О. І. Цітоу, Г. І. Часнакова. Нашы таварышы выступалі перад рабочымі непасрэдна у цэхах. Тэмы былі розныя: «Вынікі снежаньскага Пленума ЦК КПСС і II сесіі Вярхоунага Савета СССР», аб матэрыяльна-тэхнічнай базе камунізма і шляхах яе стварэння, аб культуры паводзін маладога савецкага чалавека, аб развіцці сацыялістычных нацый, аб уплыве навуковага светапогляду на мараль.

Сустрэча, задушэуная гутарка з рабочымі, абмен думкамі заусёды прыносяць вялікае маральнае задавальненне нам, выкладчыкам. Ды і нашы слухачы, калі меркаваць па водгуках, задаволены такімі сустрэчамі і выказваюць жаданне часцей слухаць нашых лектарау. Я гэта сам адчувау, выступаючы нядауна перад рабочымі прэсавага цэха па тэме «Пабудова матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма — галоуная эканамічная задача партыі і народа». Канешне, за 30 мінут усё не раскажаш. Прыйшлося спыніцца толькі на некаторых пытаннях, якія маюць прамыя адносіны да развіцця аутамабільнай прамысловасці, павышэння узроуню жыцця працоуных і г. д. Выкарыстанне найбольш даходлівага, пераканаучага матэрыялу па Саюзу ССР і Беларусі тут неабходна.

Мы часта гаворым аб сярэдняй заработнай плаце рабочых і служачых. Скажам, па Саюзу ССР яна за 1970 год склала 122 рублі. Але абмежавацца гэтым недастаткова, бо працоуныя атрымліваюць значныя выплаты і льготы з грамадскіх фондау спажывання. Гэта павышае фактычна заработную плату да 164 рублёу.

Так, напрыклад, з грамадскіх фондау спажывання дзяржава расходуе у год на утрыманне дзіцяці — 300 рублёу, навучанне школьніка — 100 рублёу, навучанне у школе-інтэрнаце — 600 рублёу, адзін дзень знаходжання у бальніцы — 5 рублёу і г. д.

Растлумачэнне такіх даных выклікае жывейшую зацікауленасць у рабочых, пераконвае іх.

Было б карысным, акрамя лекцый, дакладау і гутарак, праводзіць вечары пытанняу і адказау, а таксама выкарыстоуваць іншыя формы.

Пастаянныя узаемасувязі з работнікамі вытворчасці, дапамога глыбока зразумець многія складаныя праблемы, растлумачэнне рашэнняу партыі і урада — найпершы доуг прафесарска-выкладчыцкага саставу нашага універсітэта.

**А. БУРАЎСКІ, дацэнт.**



# КОЖНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ — САПРАЎДНЫ ЭКЗАМЕН

**Дваццаць чацвёрты год працуе ва універсітэце загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта дацэнт Васіль Аляксандравіч Дарогін. І усе гэтыя гады ён актыўны прапагандыст навуковых ведаў сярод шырокіх колаў працоўных рэспублікі.**

**Мы папрасілі В. А. Дарогіна расказаць аб яго лектарскім вопыце.**

— Сапраўдным лектарам я сябе адчуў у 1929 годзе, выступаючы як член бюро РК камсамола па пытаннях калектывізацыі сельскай гаспадаркі. А потым у студэнцкія гады, у час вучобы ў Ленінградскім універсітэце, калі ў 1936 годзе мне давялося весці растлумачальную работу сярод рабочых аднаго з заводаў па Праекту Канстытуцыі СССР.

З той пары было вельмі многа сустрэч з самымі рознымі аўдыторыямі слухачоў. Даводзілася выступаць, акрамя Мінскай, у Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцях, на прадпрыемствах, у калектывах сельскіх працаўнікоў, сярод моладзі. І кожная такая сустрэча з людзьмі—цікавая падзея для лектара і ў той жа час адказны экзамен.

Я прыпамінаю адно са сваіх выступленняў у Гродна ў адным з цэхаў азотнатукавага камбіната. Раней я тут не быў, не ведаў спецыфікі гэтага прадпрыемства. А ў час гутаркі з рабочымі, па іх пытаннях можна было меркаваць, што тут здараюцца парушэнні працоўнага заканадаўства. Прыйшлося запрасіць спецыяліста, прадстаўніка адміністрацыі і ўжо з яго дапамогай вырашаць незразумелыя пытанні і даваць кансультацыі.

З таго часу, перш чым выступаць у пэўным калектыве, я абавязкова знаёмлюся з мясцовымі ўмовамі, пагляджу, што тут ёсць добрага і дрэннага. Тады і лекцыя набывае больш канкрэтнасці, узбагачаецца цікавымі прыкладамі і фактамі.

**— Васіль Аляксандравіч, дзе давялося Вам выступаць у мінулым годзе і з якой тэматыкай?**

— Ленінскі год, мабыць, для ўсіх лектараў быў насычаным. Двойчы выступаў ва універсітэце прававых ведаў на курсах адказных работнікаў Мінскай вобласці. Тэмы лекцый: «Этапы развіцця Савецкай дзяржавы», «Сацыялістычная і буржуазная дэмакратыя», «Ленін аб сацыялістычнай законнасці» і іншыя. Па просьбе школьнікаў Заводскага раёна прачытаў лекцыю «Мараль і права». У медыцынскім інстытуце маімі слухачамі былі агітатары. Іх зацікавіла лекцыя «Закон і дысцыпліна».

**— Што даюць самому лектару сустрэчы са слухачамі?**

— Вельмі многае. Кожны выезд узбагачае лектарскую практыку, дапамагае пэўней адчуваць змены, якія адбываюцца ў жыцці, больш аператыўна адклікацца на запатрабаванні часу.




**К 50-летию университета большим коллективом авторов под руководством доцента А. И. Кожушкова готовится к изданию книга, рассказывающая о нашем университете.**

**Сегодня мы публикуем некоторые материалы из этой книги в помощь студентам-лекторам, которые во время зимних каникул выступят в различных уголках республики с лекциями о славной истории университета и его сегодняшнем дне.**

# НАКАНУНЕ СЛАВНОГО ЮБИЛЕЯ

30 ОКТЯБРЯ 1971 года Белорусский государственный ордена Трудового Красного Знамени университет имени В. И. Ленина торжественно отметит свое 50-летие. Полувековой юбилей старейшего вуза республики является большим событием в культурной жизни белорусского народа.

Менее чем через два месяца после провозглашения БССР, 25 февраля 1919 года ЦИК БССР принял декрет об открытии в Минске Государственного университета и ассигновал на его первые нужды 1 миллион рублей. Выполнению этого решения помешала временная оккупация Белоруссии белополяками, после изгнания которых летом 1920 года работы по созданию университета возобновились.

18 апреля 1921 года ЦИК БССР отмечал, что «открытие университета в гор. Минске является делом первостепенной государственной важности и настоятельно требуется культурными, экономическими и политическими интересами рабоче-крестьянского населения Белоруссии».

В Москве и Минске были созданы из видных ученых и государственных деятелей комиссии содействия открытию Белорусского университета. В подготовительных работах принимали активное участие нарком просвещения РСФСР А. В. Луначарский, зам. наркома профессор М. Н. Покровский, секретарь Центрального Бюро Компартии Белоруссии В. Г. Кнорин, председатели ЦИК БССР А. Ф. Мясников и А. Г. Червяков, видные ученые академик Е. Ф. Карский, профессора В. П. Волгин, К. А. Тимирязев, Д. Н. Прянишников, В. И. Пичета, Л. С. Минор и другие.

1 июня 1921 года 160 юношей и девушек начали занятия на рабочем факультете университета.

11 июля, в первую годовщину освобождения Минска от белополяков, состоялось торжественное собрание представителей партийных, советских, комсомольских и других общественных организаций республики, где было провозглашено создание университета. 30 октября 1921 года состоялось его торжественное открытие. А 1 ноября 1921 года 14 профессоров, 49 преподавателей, 10 ассистентов и 5 заведующих кабинетами начали регулярные занятия с 1390 студентами факультетов рабочего, общественных наук и медицинского.

За двадцать предвоенных лет университет подготовил для народного хозяйства и культуры 5240 высококвалифицированных специалистов. Накануне Великой Отечественной войны в университете училось 2 тысячи студентов, преподавательский коллектив насчитывал свыше 150 человек. Еще в 30-е годы на базе факультетов университета было создано 12 вузов и ряд научно-исследовательских институтов.

Вероломное нападение фашистской Германии прервало мирный труд советских людей. Большинство ученых университета, его сотрудников и студентов в первые дни войны ушло в ряды Советской Армии, в истребительные батальоны, народное ополчение, партизанские отряды. Многие из них проявили высокое мужество и отвагу, немало их отдали свою жизнь за свободу и независимость нашей Родины. В коллективе университета сейчас более 300 ветеранов Великой Отечественной войны.

Оккупировав Белоруссию в первые дни войны, фашисты нанесли огромный ущерб ее хозяйству и культуре. Были разрушены все учебные корпуса и общежития университета. Имущество лабораторий, кабинетов, оранжереи, библиотека, архив были либо уничтожены, либо вывезены в Германию. Убытки, нанесенные университету гитлеровцами, исчисляются в 36,5 миллиона рублей.

В суровое и трудное время войны Коммунистическая партия и Советское правительство проявили исключительную заботу о Белорусском университете. 15 мая 1943 года Совет Народных Комиссаров СССР принял постановление о возобновлении работы университета. В октябре 1943 года на ст. Сходня под Москвой к занятиям на филологическом, историческом, биологическом, географическом, физико-математическом и химическом факультетах приступило около 300 студентов. Благодаря помощи партийных и советских органов города Москвы и области, Московских педагогических институтов и университета имени М. В. Ломоносова начали быстро возрождаться кафедры, лаборатории, библиотека, учебно-вспомогательные учреждения.

После освобождения столицы Белоруссии от оккупантов университет в августе 1944 года реэвакуировался в Минск. Здесь пришлось все начинать сначала. Занятия проводились в немногих частично уцелевших зданиях средних школ в две-три смены. В свободное от учебы время преподаватели и студенты самоотверженно работали по восстановлению Минска и своего университета.

ЦК КПБ, Совет Министров БССР, партийные и советские организации оказали университету всестороннюю помощь, и в годы первой послевоенной пятилетки его учебно-производственная база достигла довоенного уровня. Были созданы предпосылки для открытия новых факультетов, кафедр, лабораторий, дальнейшего увеличения контингента студентов.

30-летие БССР и Компартии Белоруссии университет отметил большими успехами в учебной и научной работе. В ознаменование этого события ЦК ВКП(б) и Совет Министров СССР присвоили ему в январе 1949 года имя Владимира Ильича Ленина.

Годы послевоенных пятилеток стали периодом бурного развития университета. Сейчас на одиннадцати факультетах БГУ обучается около 18 тысяч советских и зарубежных студентов и аспирантов разных национальностей.

Самым крупным факультетом является **физический**, который готовит специалистов по физике, радиофизике и электронике. Здесь создана хорошая учебная и научно-экспериментальная база, работает 15 кафедр и 8 лабораторий. Факультет готовит физиков-исследователей широкого профиля для работы в заводских лабораториях, научно-исследовательских институтах и специальных конструкторских бюро, а также преподавателей для средних и высших учебных заведений. Узкая специализация осуществляется по теоретической, ядерной, молекулярной физике, теплофизике, физике твердого тела и полупроводников, оптике, спектроскопии и квантовой электронике. Кафедры и лаборатории поддерживают тесную связь с производством.

**Математический** факультет готовит высококвалифицированных математиков со специализацией по дифференциальным уравнениям, геометрии, высшей алгебре и математическому анализу. Выпускники факультета успешно работают в различных отраслях промышленности, в научно-исследовательских учреждениях, средних и высших учебных заведениях. Ученые 5 кафедр факультета разрабатывают важные проблемы теории обыкновенных дифференциальных уравнений, методов приближенных вычислений, краевых задач и особых интегральных уравнений, уравнений математической физики и топологических групп.

Самым молодым факультетом является открытый в 1970 году факультет **прикладной математики**, который готовит специалистов по математическому обеспечению электронных вычислительных машин, применению средств вычислительной техники и математическому обеспечению автоматических систем управления. Выпускников этого факультета ждет широкое поле деятельности в вычислительных центрах, на крупных заводах, в научно-исследовательских учреждениях и организациях Академии наук БССР, Госплана, ЦСУ и отраслевых министерств.

**Химический** факультет — один из крупнейших и старейший в университете. В него входят кафедры: общей, неорганической, органической, физической и коллоидной, аналитической химии, радиационной и радиохимии, строения вещества, химии нефти и химической технологии, химии высокомолекулярных соединений. Здесь готовят высококвалифицированных химиков для научно-исследовательской работы в институтах, заводских лабораториях, преподавателей средних школ и специальных учебных заведений.

Ученые факультета работают над получением новых полимерных материалов и ферритов, высокочистых антибиотиков, медпрепаратов, полупроводниковых материалов, внедрением промышленных методов ионного обмена для очистки вод. Большую актуальность имеют работы по использованию газов, образующихся в результате термохимической переработки нефти, а также изучение термохимических свойств углеродов.

На кафедрах **биологического** факультета — зоологии позвоночных животных, зоологии беспозвоночных животных, систематики и физиологии растений, дарвинизма и генетики, биохимии и биофизики, физиологии человека и животных, микробиологии — осуществляется всесторонняя подготовка специалистов по различным разделам биологии. Выпускники факультета практически решают задачи по повышению урожайности сельскохозяйственных культур, выведению новых пород животных и новых сортов растений, повышению продуктивности водоемов и ряд других важных народнохозяйственных проблем, работают в вузах, школах и техникумах. Исследования ученых-биологов посвящены разработке путей управления первичным биологическим синтезом, электрофизиологическому изучению нервной деятельности человека и животных, применению математических методов в биологии, фотосинтезу, питанию и росту растений, управлению наследственностью и жизнедеятельностью растительных организмов и другим проблемам.

На семи кафедрах **географического** факультета: экономической и физической географии СССР и зарубежных стран, общей геологии, почвоведения, геодезии и картографии, наряду с подготовкой специалистов для работы в школах, высших и средних учебных заведениях, плановых и хозяйственных органах, научно-исследовательских институтах и лабораториях, разрабатываются методические и методологические вопросы физической и экономической географии, исследуются природные условия и закономерности размещения производственных сил, влияние климатических условий на урожайность и размещение сельскохозяйственных культур, закономерности распределения микроэлементов в почвах, составляются почвенные карты колхозов и совхозов, изучаются озера республики.

На трех отделениях **исторического** факультета (истории, философии и политической экономии) готовятся преподаватели истории, философии, обществоведения и политэкономии. Часть выпускников работает в архивах, музеях и научно-исследовательских институтах.

На кафедрах истории СССР, БССР, нового и новейшего времени, древнего мира и средних веков ведется глубокое изучение важных проблем отечественной и зарубежной истории, социально-экономического развития и классовой борьбы, рабочего и национально-освободительного движения, исследуется и обобщается опыт строительства социализма и коммунизма в СССР и социалистических странах. Многие исследования ученых посвящены разоблачению буржуазных фальсификаторов истории и реакционной буржуазной идеологии.

**Юридический** факультет, состоящий из кафедр теории и истории государства и права, уголовного и гражданского права и процесса, криминалистики, государственного права и советского строительства, готовит специалистов в области правоведения для работы в суде, прокуратуре, исполнительных комитетах местных Советов депутатов трудящихся и органах государственного управления.

В научной деятельности кафедр большое место занимают проблемы развития и совершенствования советской социалистической демократии и государственности в период строительства социализма и коммунизма, укрепления социалистического правопорядка и законности, правового регулирования организации труда и многие другие.

Факультет **журналистики**, имеющий кафедры истории журналистики, теории и практики советской журналистики, радио и телевидения, стилистики и литературного редактирования, готовит работников газет, журналов, радиовещания и телевидения.

Научная работа кафедр направлена на исследование закономерностей развития и практики работы советской печати, истории дореволюционной печати России и Белоруссии, революционных традиций печати зарубежных коммунистических и рабочих партий.

**Филологический** факультет готовит преподавателей белорусского и русского языков и литератур. Здесь имеются также группы с дополнительной специализацией по польскому, чешскому и болгарскому языкам и литературам.

На восьми кафедрах факультета проводится большая и разносторонняя научная работа по теории и истории русской, белорусской и зарубежной литератур, их взаимосвязи и взаимовлиянию, по важным проблемам лингвистики, сбору, обработке и изданию поэтических сокровищ народного творчества и по ряду других.

*(Продолжение на 4-й стр.).*

*(Продолжение. Начало на 3-й стр.).*

**Подготовительный** факультет для иностранных граждан ежегодно принимает более 150 студентов, обучает их русскому языку, дает определенный объем знаний по естественным и гуманитарным дисциплинам с тем, чтобы его выпускники затем могли учиться и приобретать специальность в вузах Советского Союза. Во время обучения студенты-иностранцы широко знакомятся с советской действительностью, успехами в коммунистическом строительстве.

Часть иностранцев, окончивших подготовительный факультет, остается для дальнейшей учебы на естественных и гуманитарных факультетах университета. В аудиториях, лабораториях, библиотеках и общежитиях вместе с советскими студентами живут и работают посланцы Афганистана, Республики Куба, Мали, Венесуэлы, Ливана, Сомали, Йемена, Камеруна, Танзании, Кении, МНР, ДРВ, Болгарской Народной Республики—всего из 21 страны мира.

Наряду с подготовкой высококвалифицированных специалистов в стационарных условиях университет готовит кадры без отрыва от производства.

На **заочном** факультете и вечернем отделении университета учится около 8 тысяч студентов. На заочном факультете подготовка специалистов ведется по 10 специальностям, на вечернем отделении—по 12. Здесь готовят историков, юристов, филологов, журналистов, географов, математиков, химиков, биологов, философов, политэкономов, физиков. После окончания университета они пользуются равными правами с выпускниками стационара.

Наряду с задачей подготовки специалистов, в университете успешно решается задача повышения квалификации научно-педагогических работников. На двух факультетах — преподавателей математики и физики вузов и преподавателей общественных дисциплин средних учебных заведений ежегодно совершенствуют свои знания с отрывом от производства около 200 человек из Белоруссии, Молдавии, Латвии, Литвы и Эстонии.

Для подготовки молодежи к поступлению в университет созданы заочные подготовительные курсы на основе самоокупаемости и вечерние курсы на общественных началах, где обучается более 2 тысяч рабочих, служащих, колхозников.

Наиболее одаренные юноши и девушки наряду с занятиями в общеобразовательных школах, повышают уровень своих знаний в школах юных физиков, математиков, химиков, биологов.

В целях повышения уровня общеобразовательной подготовки рабочей и сельской молодежи и создания ей необходимых условий для поступления в университет в соответствии с постановлением ЦК КПСС и Совета Министров СССР от 20 августа 1969 года открыто подготовительное отделение по специальностям: физика, математика, биология и химия. Под руководством опытных преподавателей молодые передовики производства пополняют свои знания и, сдав выпускные экзамены, зачисляются студентами соответствующих факультетов.

Успешно и много работают по коммунистическому воспитанию студентов, слушателей, аспирантов и сотрудников коллективы общеуниверситетских кафедр истории КПСС, марксистско-ленинской философии, политической экономии, научного коммунизма, истории философии и логики, педагогики и психологии. На этих кафедрах ведется интенсивная и плодотворная научно-исследовательская работа.

Большую роль в обеспечении учебного процесса играют научные учреждения, учебные базы и лаборатории, вычислительный центр, библиотека, зоологический, геолого-минералогический и исторический музеи, кабинеты, ботанический сад, оранжерея. В лабораториях университета имеются сейчас десятки тысяч новейших научных и учебных приборов.

Вычислительный центр университета оснащен машинами «Минск-2», «Минск-32» и рядом малогабаритных вычислительных устройств. Здесь студенты проходят практику, а ученые ведут исследования по автоматизации производства, созданию новых приборов и контрольно-измерительной аппаратуры, решению инженерно-экономических задач и прикладных задач физического профиля, выполняют большое количество заказов предприятий.

В историческом музее, состоящем из отделов античного искусства, этнографии, Древнего Востока, археологии и нумизматики, имеется богатейшая коллекция монет, скульптур и предметов, добытых во время археологических раскопок.

Геолого-минералогический музей располагает более чем 10 тысячами образцов минералов и горных пород.

В зоологическом музее представлена фауна БССР, других республик и некоторых зарубежных стран, экспонируются представители почти всех классов позвоночных и беспозвоночных животных.

В оранжерее представлены различные семейства растений из стран Европы, Азии, Америки и Африки. В учебно-опытном хозяйстве вблизи Минска находится ботанический сад. Там ведется научно-исследовательская работа по генетике, систематике, физиологии растений и микробиологии, а также учебная практика студентов-биологов.

Музеи университета обслуживают в год более 14 тысяч экскурсантов.

Кафедрами и лабораториями ежегодно выполняется большой объем работ по хозяйственным договорам с предприятиями и организациями.

Решением Советского правительства Белорусский университет включен в число ведущих вузов СССР, выполняющих научные исследования, имеющие важное народнохозяйственное значение.

По решению ЦК КПБ и правительства республики в университете в ближайшее время будут открыты научно-исследовательские институты: прикладных физических проблем и прикладной математики, химии и биологии.

Библиотека университета является крупнейшей вузовской библиотекой республики. В ее фондах миллион томов учебников, пособий, справочников, энциклопедий, словарей, классической и оригинальной литературы, тысячи комплектов периодических изданий на различных языках мира.

Гордостью университета являются его кадры. Здесь работают 77 профессоров—докторов наук и более 400 доцентов—кандидатов наук. Среди них академики АН БССР лауреат Ленинской премии М. А. Ельяшевич, Герой Социалистического Труда Н. П. Еругин, А. Н. Севченко, А. В. Лыков, Ф. И. Федоров, В. И. Крылов, Н. А. Дорожкин, А. С. Вечер, Ф. Д. Гахов, члены-корреспонденты АПН СССР С. А. Умрейко, Л. С. Абецедарский; члены-корреспонденты АН БССР Л. В. Володько, В. П. Платонов, И. Н. Лущицкий, В. И. Степанов, И. М. Игнатенко, Г. Л. Старобинец и другие.

Деятельность ученых сосредоточена на 88 кафедрах самых разнообразных профилей. Коллектив ученых и преподавателей постоянно пополняется за счет выпускников аспирантуры, которая насчитывает около 400 аспирантов. Университет готовит также молодых ученых для зарубежных стран.

Университетское издательство выпускает большое количество монографий, сборников, ученых записок, научно-методической литературы, авторами которых являются ученые университета, ежегодно издает 4 серии журнала «Вестник БГУ», где публикуются новые исследования по математике, физике, механике, химии, биологии, географии, геологии, истории, философии, политэкономии, филологии, журналистике и педагогике.

Для рассмотрения докторских и кандидатских диссертаций в университете работает 7 советов, в состав которых входят крупнейшие ученые различных отраслей науки.

Широко привлекается к научным исследованиям студенческая молодежь. Научное студенческое общество объединяет более 3 тысяч студентов, действуют 72 студенческих научных кружка, литературное объединение «Узлёт», студенческая научно-исследовательская лаборатория.

В университете часто проходят межвузовские всесоюзные и республиканские научные конференции, симпозиумы и конгрессы, которые привлекают большое количество советских и зарубежных ученых.

За последние годы с целью обмена опытом, чтения лекций, повышения квалификации, совместного ведения научных исследований в университете побывало много делегаций и отдельных ученых из разных стран мира.

Для этих же целей ученые университета выезжали в учебные заведения и научные центры ГДР, Болгарии, Польши, Чехословакии, Румынии, Югославии, Англии, Франции, Японии и других стран.

Наиболее плодотворным и взаимовыгодным является научное и культурное сотрудничество с Иенским университетом им. Ф. Шиллера (ГДР), Софийским университетом им. К. Охридского (НРБ), Люблянским университетом (СФРЮ) и рядом учебных заведений ПНР. Из года в год расширяется обмен учеными, аспирантами, стажерами, студентами. Ученые взаимно посещают научные конференции, университеты-партнеры обмениваются фотовыставками, спортивными делегациями, коллективами художественной самодеятельности, ведется интенсивный книгообмен.

Международный авторитет Белорусского университета был засвидетельствован принятием его одним из первых в члены международной ассоциации университетов.

Заслуги университета в развитии науки и подготовке специалистов получили высокую оценку Коммунистической партии и Советского правительства. 7 января 1967 года Президиум Верховного Совета СССР наградил университет орденом Трудового Красного Знамени.

16 декабря 1968 года в ознаменование трудовых успехов коллектива университета, внесшего большой вклад в коммунистическое строительство в честь 50-летия БССР и КПБ Белорусский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет имени В. И. Ленина награжден Памятным Знаменем ЦК КПБ, Президиума Верховного Совета БССР, Совета Министров БССР и Белсовпрофа.

В апреле 1970 года за достижение высоких показателей в социалистическом соревновании в честь 100-летия со дня рождения В. И. Ленина ЦК КПСС, Президиум Верховного Совета СССР, Совет Министров СССР и ВЦСПС наградили Белорусский университет ленинской юбилейной Почетной Грамотой.

Воодушевленный высокой оценкой своего труда многотысячный коллектив ученых, аспирантов, студентов, сотрудников с еще большей энергией работает над претворением в жизнь величественной программы коммунистического строительства.

Ежегодно сотни комсомольцев в составе студенческих строительных отрядов отправляются на ударные стройки республики и Союза, помогают убирать урожай труженикам целинных земель, строят животноводческие фермы, школы, больницы, клубы, жилые дома. Они участвовали в строительстве мемориального комплекса на родине В. И. Ленина в Ульяновске, строили газопроводы, автомобильный гигант в Тольятти, помогали пострадавшим от землетрясения жителям Дагестана, участвовали в реставрации крепости-героя Бреста. В 1970 году строительные отряды университета освоили почти 3 миллиона рублей капиталовложений.

В 1970 году за трудовые заслуги студенческих строительных отрядов, оказавших большую помощь труженикам Казахстана в строительстве школ, клубов, больниц, детских садов и яслей, жилых домов и животноводческих построек, Президиум Верховного Совета Казахской ССР наградил университет Почетной Грамотой.

Гордостью университета были и остаются его выпускники. Менее чем за 50 лет университет дал для различных отраслей социалистического строительства почти 28,5 тысячи специалистов.

Здесь отдают дань высокого уважения тем, кто с оружием в руках ковал победу над врагом в суровые годы Великой Отечественной войны, и тем, кто приумножал и приумножает славу нашей Родины трудовыми победами.

В числе воспитанников университета лауреат Ленинской премии академик АН СССР Л. А. Арцимович, президент АН БССР Н. А. Борисевич, вице-президент АН БССР К. К. Атрахович (Кандрат Крапива), лауреат Ленинской премии, народный поэт БССР, член-корреспондент АН БССР П. У. Бровка, член-корреспондент АН СССР А. А. Шлык, министр высшего и среднего специального образования БССР профессор Н. М. Мешков, ректор университета академик АН БССР А. Н. Севченко, посол СССР в ГДР П. А. Абрасимов и многие другие.

Выпускники университета работают в Академиях наук СССР и БССР, многих вузах, научно-исследовательских учреждениях, на фабриках и заводах, в школах, редакциях газет и журналов, радио и телевидения, в учреждениях культуры. Специалистов с дипломом БГУ можно встретить также на предприятиях и в различных учреждениях ряда зарубежных стран.

Ученые университета часто представляют интересы нашей Родины в различных международных организациях. Под Уставом ООН стоит подпись делегатов БССР — профессора университета В. Н. Перцева и доцента Ф. П. Шмыгова. Профессоры И. Я. Науменко, М. М. Аваков, доценты И. И. Трухан, А. Д. Гусев входили в состав делегаций БССР на сессиях Генеральной Ассамблеи ООН. Профессоры А. Н. Севченко, Т. Н. Годнев, Б. И. Степанов, Ф. И. Федоров деятельно участвовали в работе ряда международных конференций по мирному использованию атомной энергии.

Проректоры БГУ А. Я. Малышев, С. А. Умрейко, доценты Т. И. Прищыцкая и Т. Е. Дударева являлись членами белорусской делегации на Генеральных конференциях ЮНЕСКО.

Большие успехи коллектива университета достигнуты упорным трудом под руководством партийной организации, объединяющей сейчас почти 900 коммунистов.

Верным ее помощником является комсомольская организация. Ее заслуги в 1970 году в связи с 50-летием комсомола Белоруссии отмечены Почетной Грамотой Верховного Совета БССР.

Партийная организация руководит также всеми общественными организациями: профсоюзной, спортивными, оборонными и другими.

В университете созданы все условия для того, чтобы молодежь росла политически зрелой, обладающей глубокими знаниями, идейно закаленной, физически крепкой и здоровой.

Во всем комплексе воспитательных мероприятий большое место отводится физической культуре и спорту. Свыше 5 тысяч студентов регулярно занимаются в секциях по 23 видам спорта. Спортивный коллектив имеет в своих рядах 3-х мастеров спорта международного класса, гроссмейстера по шашкам, 60 мастеров спорта, около 300 кандидатов в мастера и перворазрядников, свыше 3,5 тысячи спортсменов второго и третьего разрядов. Спортсмены БГУ принимали участие в Олимпийских играх, спартакиадах народов СССР, союзных и республиканских соревнованиях, занимали на них призовые места.

В системе эстетического воспитания видное место занимает художественная самодеятельность. Широкой популярностью в республике и далеко за ее пределами пользуются народная хоровая капелла, народный ансамбль танца «Крыжачок», народный оркестр народных инструментов, драматическая студия. Они демонстрировали свое мастерство в республиках Прибалтики, на Украине, на целинных землях Казахстана, в Польской Народной и Германской Демократической республиках. Коллективы художественной самодеятельности имеются также на всех факультетах.

В распоряжение студентов для их занятий и отдыха предоставлены прекрасные учебные корпуса, актовый и читальные залы, клубы и ленинские комнаты общежитий.

Только за последнее десятилетие учебная площадь университета увеличилась в 2,4 раза.

Летом к услугам студентов — спортивно-оздоровительный лагерь на озере Нарочь.

Удовлетворению стремлений студенческой молодежи и приобретению навыков и умений в области искусства, спорта, лекторского мастерства служит факультет общественных профессий. В течение 2—3 лет, параллельно с основными занятиями, во внеучебное время этот факультет готовит сотни лекторов, пионерских вожатых, кино- и фотокорреспондентов, руководителей коллективов художественной самодеятельности, инструкторов и судей по физической культуре и спорту.

Многосторонняя и интересная жизнь многотысячного коллектива университета широко освещается в стенных газетах учебных групп, курсов, факультетов и многотиражной газете «Беларускі універсітэт».

**Хорошо поработал коллектив университета в ленинском юбилейном году. Для народного хозяйства, культуры, науки подготовлено 2144 высококвалифицированных специалиста, учеными университета защищено 15 докторских и 47 кандидатских диссертаций, преподавателями и студентами прочитано для трудящихся городов и сел республики 3 тыс. лекций, проведено 36 научно-теоретических конференций и 65 диспутов. Издательство университета выпустило книги, брошюры, журналы 87 названий общим тиражом 450 тыс. экземпляров.**

Выполнив с честью обязательства в ленинском юбилейном году, коллектив университета борется за овладение новыми рубежами в научной и учебной деятельности, делает все, чтобы достойно встретить XXIV съезд Коммунистической партии Советского Союза.

# УСПАМІНЫ АБ АФРЫЦЫ

У складанай і адказнай рабоце лектара асабістыя уражанні адыгрываюць вялікую ролю. Падарожжы, знаёмствы з новымі краінамі і народамі узбагачаюць веды, нараджаюць новыя уяуленні, пачуцці, якія становяцца крыніцай перадачы гэтых ведау слухачам. Асабліва прыкметна я адчула гэта пасля паездкі у краіны паудня-усходняй Афрыкі.

Уяуленне аб Афрыцы звычайна асацыіруецца з асляпляльным сонцам пустыні, таямнічым шумам экватарыяльнага лесу, шэрымі вялізнымі сланамі і вобразамі карычневых паляунічых з коп'ямі.

Усё аказалася так і, разам з тым, інакш, нечаканей. За 22 гадзіны палёту на «ИЛ-18» мы перасеклі амаль увесь Афрыканскі мацярык па доугай восі, спыняючыся ненадоуга у Каіры, Хартуме, Энтэбі, Найробі. Канчатковая мэта — сталіца (Аб'яднанай) рэспублікі Танганьікі і Занзібара (Танзанія) — Дар-эс-Салам — Гавань свету.

Наша група, арганізаваная Асацыяцый афрыканасавецкай дружбы, складалася з 9 чалавек — спецыялістау розных галін ведау. На працягу 20 дзён мы мелі магчымасць пабываць у Танганьіцы, на востраве Занзібар і у Замбіі.

Танзанія — вялікая краіна (плошча 941,6 тыс. квадратных кіламетрау). Аб'яднанне незалежных Танганьікі і Занзібара адбылося у красавіку 1964 года. Пераход дзяржаунай улады у рукі народа быу здзейснен у выніку шматгадовай нацыянальна - вызваленчай барацьбы. Перамагла кіруючая у краіне партыя — Афрыканскі нацыянальны саюз (прэзідэнт Д. Ньерэрэ).

Маладая краіна узяла курс на сацыялістычныя пераутварэнні: нацыяналізацыю зямлі, ліквідацыю астаткау каланіяльнага панавання, прыняла перспектыуны план развіцця народнай гаспадаркі. Аднак пакуль што Танзанія працягвае заставацца адсталай аграрнай краінай са значным уплывам замежнага капіталу.

Асноуным прыродным багаццем краіны з'яуляюцца золата і алмазы. Вывозяць таксама трапічныя культуры: гваздзіку, кеш'ю, манга, какосавае масла і г. д.

Дар-эс-Салам — не вельмі вялікі (200 тыс. жыхароу), але даволі сучасны добраупарадкаваны горад, у архітэктуры якога адчуваецца змешаны еурапейскі, арабскі, індыйскі, афрыканскі стыль. Занзібар (па-арабску «Гавань чорных») — больш стара́дауні экзатычны горад з вузкімі крывымі вулічкамі, закрытымі унутранымі дворыкамі, з яркімі фруктовымі рынкамі і старажытнай гаванню, у якой яшчэ у канцы мінулага веку спыняліся караблі гандляроу жывым таварам.

Упершыню трапіушы у паудневае паушар'е, мы цікавіліся усім: і незнаёмым малюнкам зорнага неба, і рэзкім пераходам ад яркага дня да вельмі цёмнай ночы, і зенітальным становішчам сонца. Але асабліва вялікае уражанне выклікау цёплы Індыйскі акіян з яго прылівамі і адлівамі, каралавымі атоламі, шматлікімі незнаёмымі жывёлінамі, белымі пясчанымі пляжамі.

Унутраныя часткі Танганьікі — гэта велізарныя прасторы саван, населеных жывёлаводамі - качэунікамі масаямі. У гэтай частцы краіны размешчаны буйныя запаведнікі: Серэнгеці, Нгарангора, Маньяра і іншыя. Нгарангора знаходзіцца на вялікай вышыні у кратэры патухшага вулкана. Тут жыве каля 15 тысяч антылоп гну, 3 тысячы газеляу, 5 тысяч зебрау, насарогі, сланы, львы, гіены, бегемоты. Содавае возера у цэнтры кратэра літаральна кішыць фламінга, пеліканамі, нільскімі гусямі. Над высокай, высахшай у сухі сезон травой, мільгаюць маленькія прыгожыя антылопы імпала і яркія галовы венценосных жураулёу.

У лясным запаведніку Маньяра перад машынай дарогу нетаропка пераходзіць сям'я бабуінау, а львы спакойна спяць на высокіх дрэвах, звесіушы ногі і хвост, паклаушы галаву на зручны сук.

Замбія (плошча 752,6 тыс. квадратных кіламетрау, насельніцтва 4 млн. чалавек) таксама дабілася незалежнасці у 1964 годзе. Акружаная амаль з усіх бакоу каланіяльнымі краінамі (Ангола, Мазамбік, Паудневая Радэзія), яна знаходзіцца у больш цяжкіх палітычных і эканамічных умовах, чым Танзанія. Па-ранейшаму яе асноуныя прыродныя багацці эксплуатуюцца імперыялістычнымі дзяржавамі, асабліва гэта адносіцца да распрацовак медзі, па запасах якой Замбія займае першае месца сярод краін капіталістычнага свету.

Замбія таксама паказала нам свае цуды: запаведнікі, батанічныя сады, гарады, медныя руднікі. Але самым вялікім цудам аказауся вадапад Вікторыя на галоунай рацэ краіны Замбезі. Гэты вялізны, шумлівы, бліскучы каскад вады шырынёй больш кіламетра падае з вышыні 100 метрау. Ніжэй вадапада, праз дзікую чорную базальтавую цясніну, вырытую Замбезі, перакінуты пагранічны мост паміж Замбіяй і Паудневай Радэзіяй.

Народы Танзаніі і Замбіі, нягледзячы на усе цяжкасці, будуюць новае жыццё. Яны ствараюць нацыянальную прамысловасць, адраджаюць багатую духоуную і матэрыяльную культуру, развіццё якой штучна затрымлівалася векавым каланіяльным рэжымам. Гэтае адраджэнне выяуляецца у нацыянальных танцах і песнях, у разнастайных цудоуна выкананых карцінах, вырабах са скуры, дрэва, каменю, металу.

У час падарожжа мы лялі самалётамі, ездзілі у машынах, хадзілі па жоутай саване, купаліся у цёплай вадзе акіяна, нас абпальвала трапічнае сонца. Радавалі шчырыя усмешкі новых сяброу, і усё ж самай вялікай і радаснай падзеяй аказауся момант прызямлення нашага самалёта на мокры асфальт роднага Шарамецьеускага аэрадрома.

**О. ЯКУШКА,**
**дацэнт геафака.**






*НА ЗДЫМКАХ: афрыканскія сувеніры—там-там са шкурызебры; карал; рытуальная маска; галоука хлопчыка, зробленая з жалезнага дрэва.*

## НАПЕРАДЗЕ АДКАЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

Секцыя веславання адна з самых маладых ва універсітэце. Толькі з 1969 года у БДУ пачау культывавацца гэты від спорту, і малады трэнер Анатоль Сяргеевіч Балдзін прыступіу да заняткау са студэнтамі. Менш чым праз год, у ліпені 1970 года, БДУ ужо удзельнічау у першынстве вышэйшых навучальных устаноу рэспублікі, дзе наша маладая каманда веславальшчыкау заняла чацвёртае месца.

Пакладзен добры пачатак. І зараз мы можам называць імёны лепшых спартсменау, якія абараняюць гонар БДУ на блакітных дарожках. Гэта— Ніна Целяпнёва, студэнтка II курса філалагічнага факультэта, майстар спорту, чэмпіёнка СССР сярод школьнікау 1969 года. Селетні сезон таксама прынёс ёй перамогу — дзяучына атрымала залаты і бронзавы медалі Універсіяды-70, якая праходзіла у Саратаве, бронзавы — на розыгрышы кубка БССР у Брэсце.

Генадзь Парамонау, будучы фізік,— неаднаразовы прызёр першынства БССР і іншых адказных спаборніцтвау. Многа у секцыі і здольнай моладзі.

— Я лічу, — гаворыць А. С. Балдзін, — што у нашым універсітэце ёсць усе магчымасці для далейшага развіцця гэтага віду спорту. Па вуліцы Кастрычніцкай, дзе знаходзяцца 2 інтэрнаты, а зараз будуецца трэці, жыве вялікая колькасць студэнтау. Нядрэнна было б мець побач сваю спартыуную базу. Зараз Свіслач бярэцца у граніт і пасля злучэння з Віліяй стане пауначоднай. Было б вельмі добра, каб на яе воднай гладзі паявіліся хуткія байдаркі нашых спартсменау.

Шмат працуе са сваімі выхаванцамі трэнер А. С. Балдзін. Ён стараецца зрабіць складаныя трэніроукі больш цікавымі. Вясной яны праходзяць на Камсамольскім возеры, вадасховішчы Пціч. У час летніх канікулау секцыя выязджала на возера Нарач, дзе працягвала рыхтавацца да спаборніцтвау. Зімой у хлопцау і дзяучат з секцыі веславання таксама разнастайная праграма трэніровак.

Трэба сур'ёзна рыхтавацца, бо у новым сезоне членау нашай зборнай каманды па веславанню чакае шмат адказных спаборніцтвау. Галоунае з іх — Спартакіяда народау СССР (кандыдатам у зборную рэспублікі залічана Н. Целяпнёва). Не менш важныя—розыгрыш кубка БССР па веславанню, першынство вну і шмат іншых спаборніцтвау, на якіх побач з вопытнымі веславальшчыкамі будзе выступаць моладзь.

**Л. ШЫГАНАВА.**

### У ГАСЦЯХ ВІЯ АРТМАНЕ

15 студзеня у актавай зале універсітэта адбылася творчая сустрэча студэнтау і супрацоунікау БДУ з народнай артысткай СССР Віяй Артмане.

Актрыса расказала аб сваім творчым шляху, падзялілася планамі на будучае. У заключэнне прысутныя паглядзелі кінафільм «Родная кроу», дзе В. Артмане выконвала галоуную ролю.

**С. МІШУХІН.**

**У «Старонцы народнага кантролю» («Беларускі універсітэт» за 10 снежня) былі змешчаны крытычныя матэрыялы. Сёння мы друкуем адказы на іх.**

## НАМ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

● Крытычны матэрыял «Ёсць магчымасці, а адказнасць?..», апублікаваны у газеце «Беларускі універсітэт» (№ 36 за 10 снежня) аб выніках праверкі камітэтам народнага кантролю універсітэта інтэрната № 6, абмяркоувауся на вытворчай нарадзе гаспадарчай часткі, дзе каменданту інтэрната тав. Цурко У. П. указана на недастатковую работу у інтэрнаце па навядзенню і падтрыманню парадку.

На нарадзе вызначаны канкрэтныя меры па паляпшэнню бытавых умоу студэнтау. На другую палову студзеня гэтага года намечан вялікі рамонт інтэрната № 6.

**Н. ЛЕПІЛА,**
**намеснік прарэктара**
**па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы.**

● Для наладжвання выдачы заработнай платы у 1969 годзе была адкрыта яшчэ адна, трэцяя каса. У красавіку 1970 года загадчыкам агульнауніверсітэцкіх кафедр было накіравана пісьмо з просьбай вызначыць грамадскіх касірау. З усіх кафедр такіх касірау выдзелілі толькі кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтау, падрыхтоучы факультэт і кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі.

У снежні 1970 г. усім факультэтам, лабараторыям і кафедрам зноу было накіравана такое ж пісьмо. Прапановы павінны былі паступіць да 20 снежня, аднак яны паступілі толькі ад пяці падраздзяленняу. Як толькі паступяць адказы ад усіх аддзелау, факультэтау, кафедр, будзе зроблен вывад аб выдачы зарплаты праз грамадскіх касірау.

**Э. БЯЛЯЎСКІ,**
**галоуны бухгалтар БДУ.**



*ЗІМОВЫЯ ЦЕНІ.* Фотаэцюд *Г. Марозава.*

**Згублены студэнцкі білет, выдадзены Белдзяржуніверсітэтам імя У. І. Леніна на імя студэнткі матфака ЯФІМЕНКА Зоі Міхайлауны за № 680288, лічыць несапраўдным.**

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз. АТ 09540 Зак. № 88.